**М.У. Гуль** (Беларусь, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт)

# СЛОВАЎТВАРЭННЕ АД АСНОЎ ІНШАМОЎНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ЛЕКСІКІ)

Адной з важнейшых прымет засвоенасці іншамоўных адзінак з'яўляецца іх словаўтваральная актыўнасць. У межах грамадска-палітычнай лексікі пры словаўтварэнні ад асноў іншамоўных прыметнікаў выкарыстоўваюцца такія спосабы, як суфіксацыя, прэфіксацыя, кампазіцыя; марфолага-сінтаксічны спосаб.

Ад асноў іншамоўных прыметнікаў утвараюцца субстантывы пры дапамозе

1) **суфікса -асць**: *апалітычны → апалітычнасць, аналітычны → аналітычнасць, антаганістычны → антаганістычнасць, гетэрагенны → гетэрагеннасць, дагматычны → дагматычнасць, дыялектычны → дыялектычнасць, ідэйны → ідэйнасць, метафізічны → метафізічнасць, сінтэтычны → сінтэтычнасць, стыхійны → стыхійнасць, філасафічны → філасафічнасць* (ад асноў **грэчаскага** паходжання); *антычны → антычнасць, сацыяльны → сацыяльнасць; абсалютны → абсалютнасць, абстрактны → абстрактнасць, акцыдэнтальны → акцыдэнтальнасць, амбівалентны → амбівалентнасць, апрыёрны → апрыёрнасць, гуманны → гуманнасць, дыскрэтны → дыскрэтнасць, іманентны → іманентнасць, імператыўны → імператыўнасць, інтэлігібельны → інтэлігібельнасць, інтэрсуб'ектыўны → інтэрсуб'ектыўнасць, інтэнсіянальны → інтэнсіянальнасць, інтэнцыянальны → інтэнцыянальнасць, ірацыянальны → ірацыянальнасць, ірэальны → ірэальнасць, калегіяльны → калегіяльнасць, калектыўны → калектыўнасць, ментальны → ментальнасць, нацыянальны → нацыянальнасць, нестабільны → нестабільнасць, публічны → публічнасць, рэальны → рэальнасць, рэлятыўны → рэлятыўнасць, рэфлектыўны → рэфлектыўнасць, спантанны → спантаннасць, спекулятыўны → спекулятыўнасць* (спекулятивность), *спекуляцыйны → спекуляцыйнасць* (умозрительность), *стабільны → стабільнасць, суб'ектны → суб'ектнасць, суб'ектыўны → суб'ектыўнасць, субстанцыяльны → субстанцыяльнасць, трансцэндэнтны → трансцэндэнтнасць, эквівалентны → эквівалентнасць* (ад асноў **лацінскага** паходжання); *агрэсіўны → агрэсіўнасць, аўтарытарны → аўтарытарнасць, геніяльны → геніяльнасць, ідэальны → ідэальнасць, інварыянтны → інварыянтнасць, індывідуальны → індывідуальнасць, канкрэтны → канкрэтнасць, лаяльны → лаяльнасць, мадальны → мадальнасць, маргінальны → маргінальнасць, партыйны → партыйнасць* (ад асноў **французскага** паходжання);

2) **фарманта -ств-а/-цтв-а:** *лютэранскі → лютэранства, пратэстанцкі → пратэстанцтва* (ад асноў **нямецкага** паходжання); *мусульманскі → мусульманства, магаметанскі → магаметанства* (ад асноў **арабскага** паходжання); *сектанцкі → сектанцтва, дыктатарскі → дыктатарства, прэсвітэрыянскі → прэсвітэрыянства* (ад асноў **лацінскага** паходжання); *піфагарэйскі → піфагарэйства* (ад асноў **грэчаскага** паходжання); *дактрынёрскі → дактрынёрства* (ад асноў **французскага** паходжання); *лідарскі → лідарства, пурытанскі → пурытанства* (ад асноў **англійскага** паходжання);

3) **суфікса -ізм/-ызм:** *арганічны → арганіцызм, вальтэр'янскі → вальтэр'янізм* (ад асноў **французскага** паходжання); *інстынктыўны → інстынктывізм, казуальны → казуалізм, кумулятыўны → кумулятывізм* (ад асноў **лацінскага** паходжання); *еўрапейскі → еўрапеізм* (ад асноў **грэчаскага** паходжання); *гільдзейскі* (сацыялізм) *→ гільдэізм* (ад асноў **нямецкага** паходжання).

Субстантывы з **суфіксам -ец** абазначаюць асоб па іх адносінах да грамадскай плыні, вучэння, групоўкі [1, с. 234]: *берштэйніянскі → берштэйніянец, гегельянскі → гегельянец, кантыянскі → кантыянец, младагегельянскі → младагегельянец, старагегельянскі → старагегельянец* (ад асноў **нямецкага** паходжання).

Субстантывы ўтвараюцца ад асноў іншамоўных прыметнікаў пры дапамозе **марфолага-сінтаксічнага** спосабу: *абстрактнае, абсалютнае, абсалютна-апасродкаванае, абсалютна-безумоўнае, абсалютна-ісціннае, абсалютна-непасрэднае, абстрактнае, абстрактна-ўсеагульнае, аб'ектыўнае, адэкватнае, апрыёрнае, ірацыянальнае, ірэальнае, рацыянальнае, спекуляцыйнае, субстанцыяльнае, суб'ектыўнае, трансцэндэнтальнае, трансцэндэнтнае* (ад асноў **лацінскага** паходжання); *лагічнае, трагічнае* (ад асноў **грэчаскага** паходжання); *ідэальнае, канкрэтнае* (ад асноў **французскага** паходжання).

Ад асноў іншамоўных прыметнікаў утвараюцца прыметнікі пры дапамозе

1. **прэфікса анты-**. Такія абазначаюць прымету, супрацьлеглую або супрацьпастаўленую той, што названа ўтваральным словам. Гэты тып прадуктыўны ў грамадска-палітычнай тэрміналогіі [1, с. 311]: *антыамерыканскі, антыбальшавіцкі, антыбеларускі, антыбрытанскі, антыбуржуазны, антыбюракратычны, антываенны, антыгуманістычны, антыдзяржаўны, антызаходніцкі, антыімперскі, антыімперыялістычны, антыінтэлектуальны, антыінтэлігенцкі, антыісламскі, антыкаланіяльны, антыкамуністычны, антыканстытуцыйны, антыкапіталістычны, антыкаталіцкі, антыклерыкальны, антыкультавы, антыліберальны, антымарксісцкі, антымаскоўскі, антыматэрыялістычны,*

*антымілітарысцкі, антынародны, антынатаўскі, антынацысцкі, антынацыянальны, антынямецкі, антыпартыйны, антыперабудовачны, антыпольскі, антыправаслаўны, антыпралетарскі, антыпрэзідэнцкі, антырасійскі, антырэлігійны, анты-сацыял-дэмакратычны, антысацыялістычны, антысацыяльны, антыславянскі, антысталінісцкі, антысталінскі, антысхаластычны, антытаталітарны, антытурэцкі, антыўніяцкі, антыўрадавы, антыцаркоўны, антычалавечны, антыэстэтычны*;

2. **прэфікса да-.** Уласнабеларускі прэфікс можа спалучацца з запазычанай асновай: *дакласавы, дасацыялістычны*.

**Складаныя прыметнікі**. У грамадска-палітычнай лексіцы складаныя прыметнікі, першым кампанентам якіх з’яўляюцца суфіксальныя асновы прыметнікаў *сацыяльн-* і *філасофск-*, складаюць значную колькасць: ***сацыяльна****-антаганістычны, сацыяльна-біялагічны, сацыяльна-бытавы, сацыяльна-выхаваўчы, сацыяльна-гігіенічны, сацыяльна-гістарычны, сацыяльна-грамадскі, сацыяльна-гуманітарны, сацыяльна-дэмаграфічны, сацыяльна-крытычны, сацыяльна-культурны, сацыяльна-палітычны, сацыяльна-педагагічны, сацыяльна-пераўтваральны, сацыяльна-побытавы, сацыяльна-прававы, сацыяльна-пратэставы, сацыяльна-прафесійны, сацыяльна-працоўны, сацыяльна-псіхалагічны, сацыяльна-спартыўны, сацыяльна-філасофскі, сацыяльна-экалагічны, сацыяльна-эканамічны, сацыяльна-эстэтычны, сацыяльна-этнічны, сацыяльна-этычны*; ***філасофска****-алегарычны, філасофска-антрапалагічны, філасофска-апавядальны, філасафска-багаслоўскі, філасофска-гістарычны, філасофска-дыдактычны, філасофска-ідэалістычны, філасофска-літаратурны, філасофска-мастацкі, філасофска-матэрыялістычны, філасофска-містычны, філасофска-павучальны, філасофска-сацыялагічны, філасофска-светапоглядны, філасофска-сузіральны, філасофска-тэалагічны, філасофска-тэарэтычны, філасофска-філалагічны, філасофска-эканамічны, філасофска-элегічны, філасофска-эстэтычны, філасофска-этычны, філасофска-юрыдычны*.

Дастаткова прадуктыўным з’яўляецца словаўтваральны тып, які мае першым кампанентам ***сацыя-*** (ад лац. socialis – грамадскі): *сацыябіялагічны, сацыягуманітарны, сацыякультурны, сацыялінгвістычны, сацыяметрычны, сацыяпрыродны, сацыяпсіхалагічны, сацыястатыстычны*.

Для ўтварэння прыметнікаў у грамадска-палітычнай лексіцы выкарыстоўваецца словаўтваральны тып з першым кампанентам ***сацыял-***: *сацыял-дэмакратычны, сацыял-згодніцкі, сацыял-імперыялістычны, сацыял-імперыялісцкі, сацыял-патрыятычны, сацыял-пацыфісцкі, сацыял-рэвалюцыйны, сацыял-рэфармісцкі, сацыял-фашысцкі*.

Дзеясловы з **суфіксам** ***-ізава-/-ызава-*** ўтвараюцца ад прыметнікаў і маюць значэнне ‘надзяляць прыметай, уласцівай утваральнаму слову’: *бальшавіцкі → бальшавізаваць, дэмакратычны → дэмакратызаваць*. Пры ўтварэнні адсякаюцца суфіксы ўтваральных прыметнікаў ***-ск- (-цк-), -чн-***. Тып прадуктыўны ў грамадска-палітычнай тэрміналогіі [1, с. 325].

Ад асноў іншамоўных прыметнікаў утвараюцца прыслоўі з суфіксам **-а**: *сацыяльны → сацыяльна* (ад асноў **лацінскага** паходжання); *філасафічны → філасафічна* (ад асноў **грэчаскага** паходжання).

Такім чынам, у грамадска-палітычнай лексіцы ад асноў іншамоўных прыметнікаў утвараюцца назоўнікі (суфіксальным спосабам, марфолага-сінтаксічным спосабам), прыслоўі, дзеясловы (суфіксальным спосабам), прыметнікі (прэфіксальным спосабам, кампазіцыяй). Найбольш прадуктыўнымі фармантамі пры ўтварэнні ад іншамоўных прыметнікаў з’яўляюцца **суфікс** ***-асць***, **прэфікс** ***анты-***. Найбольшая колькасць утварэнняў характэрна для прыметнікаў грэка-лацінскага паходжання. Вялікія дэрывацыйныя магчымасці такой лексікі сведчаць аб глыбіні яе засваення ў беларускай мове.

**Літаратура**

1. Беларуская граматыка : у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1 : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. – 431 с.